Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЛІПЕНЬ 28 1932 г. № 167 (4419).

Год выдавання XV

Пралетары ўсіх краёў, з...

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Ні аднаго бервяна не пакінуць у вадзе. КАНЕЦКІ — У пошуках «працяга бою барыкады» (2-я стар.).

Вучэньне Маркса-Леніна — у масы (2-я стар.).

Аб плане завозу тавараў у раённым разрэзе па БССР — Пастанова ЦК КП(б)Б (1 стар.).

ВЫНІКІ 3-й СЭСІІ ЦВК БССР X СКЛІКАНЬНЯ — Прамова тав. Чарнікова на закрыцьці 3-яй сэсіі ЦВК БССР (3 стар.).

Ушчыльненыя тэрміны ўборкі — рашаючая мера ў барацьбе са стратамі (1 стар.).

Блізкэйшыя дэкады вырашаюць забесьпячэньне сацыялістычнай жывёлагадоўлі сакавітымі кармамі (1 стар.).

ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Клясавыя баі ў Польшчы абвастраюцца (4 стар.).

«Перамога» нацыянал-цараністы (4-я стар.).

НІ АДНАГО БЕРВЯНА НЕ ПАКІНУЦЬ У ВАДЗЕ

Сплаў належыць да такіх вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва, дзе ўсе асноўныя работы вытвараюцца на працягу пэўнага адрэзку часу — сэзону. Гэта акалічнасьць патрабуе выключнай напружанасьці ў рабоце. Асабліва ў першы пэрыяд кампаніі (красавік — чэрвень), калі кожная невялікая рэчка пры рацыянальным яе выкарыстаньні можа адыграць вялікую ролю ў дастаўцы драўніны з глыбінных пунктаў.

Гэты пэрыяд скончыўся. Але вынікі выкананьня сплаўной кампаніі нездавальняючыя. Згодна календарнага пляну Лесбелу да 1-га ліпеня павінна быць сплаўлена драўніны ня менш 65 проц. гадавой праграмы. Фактычна-ж на 20 ліпеня пушчана на ваду лесу толькі 60 проц. Калі ўлічыць, што больш 20 проц. пушчанай драўніны знаходзіцца яшчэ ў дарозе, дык стане зусім ясным, якое вялікарнае адставаньне мы маем на сплаўным фронце.

Асабліва слаба ідзе сплаў дравяной масы. Дровы, якія прызначаны да сплаву, у асноўнай сваёй масе знаходзяцца яшчэ ў глыбінных пунктах. Калі ў бліжэйшыя дні ня будуць ужыты самыя рашучыя меры па пуску драўніны на ваду фарсаванымі тэмпамі, становішча на сплаўным фронце яшчэ больш ускладніцца. Яно (становішча) ускладняецца яшчэ і тым, што ў сувязі з палявымі работамі пэўная частка сэзоньнікаў пакінула сплаў.

Але ці азначае гэта, што даная труднасьць ня можа быць пераможана? Ні ў якім разе. Такіх крэпасьцей, якіх не маглі-б узяць бальшавікі, няма. Трэба толькі ўмець правільна расставіць сілы і арганізаваць працу. Што справа заключаецца іменна ў гэтым, сьведчыць вопыт ударнай работы раду вучасткаў і брыгад — плытагонаў. Так, у Іпіцкім вучастку пры ўкараненьні ў работу сапраўднага брыгаднага мэтаду і пераводу рабочых на індывідуальную зьдзельшчыну, большасьць брыгад сыстэматычна перавыконвае свае нормы. На рэчцы Унечка (Гомельская кантора сплаву) брыгада тав. Удалога змагла арганізаваць сваю работу так, што на працягу 180 клм. прыганяла ў Гомель плыты з лесам замест 10-12 дзён, паводле пляну, за 5 дзён, без найменшых страт драўніны.

Аднак, калі ўзяць арганізацыю працы на сплаве ў цэлым, дык справа стаіць зусім нездавальняюча. У значнай частцы вучасткаў па сутнасьці ніякай арганізацыі працы няма. Работа вытвараецца па-старынцы арганізацыі, на чало з так званым падрадчыкам, у якім вучастак заключае дагавор на сплаў пэўнай колькасьці драўніны і справа на гэтым канчаецца. Як расстаўляецца рабочая сіла і арганізоўваецца праца ў гэтых арцелях, вучасткі ня цікавяцца. У выніку абязьлічка ў рабоце і ўраўнілаўка ў зарплаце панучча.

Задача зараз заключаецца ў тым, каб не паслабляючы барацьбы за арганізаваны набор рабочай сілы ў калгасах і вёсках, дзе ёсьць лішкі яе, рашуча змагацца з кваснасьцю і кансэрватызмам, які праяўляецца з боку паасобных работнікаў у нежаданьні пераключыцца на новыя мэтады арганізацыі працы на сплаве.

Аб паяўнасьці коснасьці і кансэрватызму ў сплаўным апараце, асабліва ў яго сярэднім зьвяне, сьведчыць перш за ўсё сам склад апарату. Дзесятнікі ў большасьці сваёй зьяўляюцца людзьмі, у галовах якіх яшчэ моцныя традыцыі працаваць па-старынцы, самацёкам. І зусім невыпадкова, калі паасобныя работнікі адкрыта заяўляюць: «Мы пра павалі бяз усякіх брыгад і спаборніцтва і будзем працаваць далей». (Дзесятнік Ніжняя-Дальнянскага вучастку — Левін). Зразумела, гэта зусім ня выключае таго, што ў радзе месц асобныя работнікі новага закалу, нават камуністы, таксама бязьдзейнічаюць у даным пытаньні, ідуць па лініі найменшага супраціўленьня.

Умацаваньне сплаўнога апарату — адно з важнейшых зьвеньняў барацьбы за сплаў. Аднак, сэктар кадраў Лесбелу ў гэтых адносінах зусім бязьдзейнічае.

Мэханізацыя сплаўных работ — «вузкае месца» ў рабоце Лесбелу. Ня гледзячы на значнае павялічэньне ў гэтым годзе адзінак мотафлёту (з 5 да 29), выкарыстаньне яго яўна невыстарчальнае. 6 катэраў да гэтага часу зусім не зданы ў эксплёатацыю. На выгрузцы драўніны з 5-ці лябёдак устаноўлены і працуюць толькі 3. Адзіны ў гэтым годзе плытавязальны варштат таксама яшчэ не працуе.

Арганізацыя працы і працдысцыпліна сярод матарыстаў вельмі слабая. Аб гэтым ярка сьведчаць аварыі мотафлёту. За даны пэрыяд па нядбайнасьці матарыстаў зьнішчаны два катэры: адзін затоплен, другі спален.

У аплаце працы матарыстаў дапушчаны грубыя скажэньні. Замест устанаўленыя нор мвыпрацоўкі ў тона-кілёмэтрах, матарыстам выплачваецца зарплата ад колькасьці прароблених гадзін.

У расходваньні гаручага поўны хаос. Норм на кожную адзінку мотафлёту не ўстаноўлена. У выніку замест эканоміі гаручага — значны яго перарасход.

Такога становішча з выкарыстаньнем мэханізмаў — рашаючай сілы на сплаве — у далейшым нельга цярпець. Неабходна ўжыць усе захады да таго, каб у бліжэйшыя дні скончыць мантаж і здаць у эксплёатацыю ўсе адзінкі мотафлёту, выгрузачныя лябёдкі і плытавязальны варштат. Асаблівую ўвагу трэба аддаць арганізацыі працы і перабудове зарплаты матарыстаў, рашуча выкараняючы абязьлічку і ўраўнілаўку.

Грамадзкае харчаваньне на сплаве — важнейшае зьвяно снабжэньня плытагонаў — пастаўлена нездавальняюча. Мерапрыемствы партыі і ўраду аб самазагатоўках, трусагадоўлі і калгасным гандлі, лясной кааперацыі ажыцьцяўляюцца зусім слаба. Да гэтага часу ні ў адным буйным сплаўным вучастку калгасная крамы не адкрыты. Трусагадоўчых пунктаў таксама няма. Сьвінаадкормачныя дзе-ні-дзе ёсьць, але іх рабоце з боку гаспадарчых і кааперацыйных арганізацый не аддаецца ніякай увагі.

Партыя ня можа мірыцца з такой работай лясной кааперацыі. Ня можа таму, што ў нас ёсьць усе магчымасьці для разгортваньня самазагатовак і арганізацыі калгаснага гандлю.

Нарэшце, трэба самым рашучым чынам падкрэсьліць зусім слабае разгортваньне культурна - масавай работы на сплаве. Яна амаль ня існуе. Адзіны культплян ЦП саюзу лесдрэўрабочых застаўся на паперы. Большасьць культбаз зусім не адкрыта. Тыя-ж, што адкрыты, ніякай работы не праводзяць. Такое-ж становішча і з прафсаюзнай сеткай. На некаторых сплаўных вучастках яшчэ не арганізаваны сплаўкомы. Прафарганізатары ў брыгадах амаль ня існуюць. Усё гэта не магло не адбіцца на разгортваньні сацыялістычных форм працы на сплаве, а значыць і на выкананьні сплаўной праграмы.

На ўзмацненьне культурна - масавай работы на сплаве неабходна зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу. ЦП саюзу лесдрэўрабочых абавязана прыняць усе меры да ажыцьцяўленьня адзінага культпляну. Прафсаюзная сетка на месцах павінна быць неадкладна ўмацавана лепшымі кадрамі.

Сплаўная кампанія ўступіла ў другую палову сэзону. Зараз асноўныя работы згуртоўваюцца на магістралях. Аднак, гэта ні ў якім разе не азначае, што на выплавачных рэчках сплаў драўніны павінен спыніцца. Трэба выкарыстаць усе магчымасьці, каб ні воднага бервяна не засталося ў глыбінных пунктах. Вялікую ролю павінна адыграць будаўніцтва плацін для затрыманьня вады на мелкіх мясцох, каб даць свабодны праход плытам з лесам.

Толькі на аснове жорсткай непрымірымай барацьбы з клясавым ворагам і яго агентурай — правымі і «левымі» апартуністамі, на аснове поўнай рэалізацыі 6 умоў тав. **Сталіна**, мы дабіемся перамог на сплаве.

УШЧЫЛЬНЕНЫЯ ТЭРМІНЫ ЎБОРКІ— рашаючая мера ў барацьбе са стратамі

Ці адказвае Гомельская МТС за ўборку

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). Да 5-га жніўня па раёну трэба ўбраць 2.168 га азімых. Перадавыя калгасы ўжо па-баявому разгарнулі жніво. Буйнейшы калгас **«Пралетары»** першым пачаў уборку жыта і ячменю. 6 жнівярак калгасу добра адрамантаваны. 4 пасталінныя паляводчыя брыгады пачалі ўборку на сваіх вытворчых вучастках.

Але ў цэлым раён сустроў уборку азімых непадрыхтаваным з прычыны злачынай бязьдзейнасьці МТС і райза. МТС датэтуль не давяла ўборачных плянаў да калгасаў і не забясьпечыла апэрацыйнага кіраўніцтва падрыхтоўкай да ўборкі. **25 проц. машын калгасаў не адрамантаваны.** Некаторыя калгасы маюць лішні машын, у другіх іх не хапае. Напрыклад, у калгасе **«Чырвоны хлебароб»** ёсьць 4 жнівяркі, а патрэбна калгасу 2, у той час, як у калгасах «Чырвоны каапэратар» і «Чырвоны пуцілавец» няма ні аднэй.

МТС зараз атрымала 6 паўкамбайнаў. Пры недахваце ўборачных машын паўкамбайны, пры адпаведным іх ужарыстаньні, маглі-б значна паскорыць уборку. Але гэтыя складаныя машыны стаяць без руху. МТС загадзя не паклапацілася падрыхтаваць людзей, якія змаглі-б працаваць на гэтых машынах.

Дырэктар МТС, каб апраўдаць сваю бязьдзейнасьць, спасылаецца на такія «аб'ектыўныя» прычыны, як зьезд дырэктароў у Менску.

— Мы ўсе былі заняты, — вось яго адказ.

У часе веснавой сяўбы Гомельская МТС не забясьпечыла апэрацыйнага кіраўніцтва калгасамі. Тое самае паўтараецца і зараз у часе ўборкі.

Мы лічым, што кіраўніцтва Гомельскай МТС трэба ўмацаваць больш здольнымі працаўнікамі, якія сапраўды мабілізоўвалі-б калгасныя масы на пасьпяховае правядзеньне ўборкі ўраджаю.

Н. Г.

УБОРКА ІЛЬНУ. (Калгас «Апора саветаў», Лёзьнянскага раёну).

Паршын заклапочан

Загадчык Ельскага райза тав. Паршын за апошнія дні вельмі заклапочан, валасы ўжо сталі дыбам і шапка лезе на бекрень.

Чытач напэўна падумае, што Паршын, непасрэдны кіраўнік сельскай гаспадаркі раёну, пенажоціца пра запасныя часткі, якіх не хапае ў калгасе, пра змазачныя матэрыялы, у якіх адчуваецца вялікая патрэба, або пра ход ўборкі азімых.

Дарэмна вы будзеце перабіраць у сваёй памяці ўсе вузлавыя пытаньні ўборачнай, ад якіх залежыць пасьпяховая ўборка азіміны.

Гэта менш усяго хвалюе Паршына. Калі зварочваешся да яго з запытаньнем, як ідзе ўборка, Паршын адказвае—«Я ня ведаю, ідзеце да каморніка, можа ён ведае».

Усе помыслы Паршына накіраваны ў адзін пункт, як-бы лепш правесьці надыходзячы палявы сэзон.

Паршын штодзенна правярае сваю двухстволку, стараннa корміць сабак, але менш усяго думае пра ўборку.

Мы просім Наркамзем вызваліць Ельскае райза ад паляўнічых практыкаваньняў Паршына.

П.

Апошнія весткі з уборачнай

МАГІЛЕЎ. Перадавыя калгасы Магілеўшчыны, скончыўшы ўборку сенажацяй, пераключыліся на ўборку азімых і яравых культур. Калгасы **«Камінтэрн»** і **«Чырвоны партызан»** добра падрыхтаваліся да ўборкі. Першы за два дні зжаў больш 14 га, а другі—12 га. Нормы выпрацоўкі ў абодвух калгасах перавыконваюцца.

Пачалі ўборку і аднаасобнікі. Вёска **Вельчыцы**, Грабянеўскага сельсавету, зжала 30 га, вёска **Коцны**—16 га.

БУДА-КАШАЛЁВА. 20 ліпеня калгасы **«Гром»**, імя **Будзённага**, **«Цягнік»** і **«Новае жыцьцё»** пачалі ўборку азімых. За дзень зжата 30 га. Калгас **«Новае жыцьцё»** правёў першы абмалот. Збожжа аказалася вышэйшай якасьці. Аднаасобнікі вёскі **Яленец** ужо скончылі жніво азімых на плошчы ў 110 га.

Прывітаньне трэцяму ўсесаюзнаму зьлёту юных авіябудаўнікоў

Вы, таварышы, на справе выконваеце указаньне тав. Сталіна аб аўладаньні тэхнікай. Ваша работа накіравана на вырашэньне грандыёзнай задачы—на аўладаньне стыхіяй паветры. Вырашаючы гэту задачу, мы аблягчаем сувязь паміж асобнымі часткамі нашага вялізарнага Саюзу, нясем сацыялістычную культуру ў самыя далёкія і глухія куткі нашай краіны.

У другой пяцігодцы паштовы, пасажырскі і грузавы авіярух павінен заняць значнае месца ў нашым савецкім транспарце.

Сваёй работай вы рыхтуеце надзейных кадры для савецкай авіяцыі.

Яшчэ больш, яшчэ грандыёзней пэрспэктывы разьвіцьця паветраных зносін у будучым сусьветным сацыялістычным грамадзтве, калі пераможная пралетарская рэвалюцыя сатрэ межы буржуазных дзяржаў, што аддзяляюць працоўных адзін ад другога. Гэтыя пэрспэктывы павінны натхняць вас таму, што вам—моладзі—прадстаіць давесьці барацьбу за сацыялізм да канца, вам прадстаіць, як указваў У. І. Ленін, пабудаваць камуністычнае грамадзтва. Гэтыя пэрспэктывы павінны прымушаць вас да таго, каб у сваёй рабоце спалучаць аўладаньне тэхнікай акцыяцы з адданай барацьбой за сацыялізм і за першую крэпасьць пралетарскай рэвалюцыі—СССР.

Пасьля перамогі сусьветнай рэвалюцыі авіяцыя стане выключна сродкам мірнай культурнай сувязі ў бясклясавым, сацыялістычным грамадзтве. У наш-жа час капіталісты выкарыстаюць авіяцыю як мацнейшы сродак разбурэньня, як вастрэйшую зброю імпэрыялістычнай вайны.

Не забывайце аб гэтым, таварышы, працуйце пад умацаваньнем савецкай авіяцыі —вернага паветранага вартавога савецкіх межаў, апоры нашай абароны.

Постышаў.

БЛІЖЭЙШЫЯ ДЭКАДЫ ВЫРАШАЮЦЬ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ САКАВІТЫМІ КАРМАМІ

Сіласаваньню—апэрацыйнае кіраўніцтва

Паводле вобразнага выразу амэрыканцаў, сілас ператварае зіму для жывёлы ў суцэльнае лета. Сілас — сакавіты корм, багаты бялкамі і вітамінамі, якія асабліва неабходны для росту і разьвіцьця ўсякага арганізму жывёлы.

У нас, у БССР, за апошнія тры гады з магутным ростам калектывізацыі сілас стаў справай дзесяткаў тысяч калгасьнікаў, рабочых саўгасаў і аднаасобнікаў. Практыкай сіласаваньня разьбіта коснасьць і руціна, разьбіта недавер'е да гэтага каштоўнейшага і сакавітага корму для рагатай жывёлы.

Дзякуючы сіласу, рад калгасаў і саўгасаў пакончылі з веснавой бяскормицай. Дзякуючы сілясу, у радзе саўгасаў і калгасаў зімою і раньняй вясной павысіўся ўдой. Напрыклад, саўгас **«Уваравічы»** зімой гэтага году, перайшоўшы на сілас, павялічыў сутачны ўдой на некалькі літраў. Такое зьявішча мы наглядалі і ў калгасах **Меншчыны** і **Лепельшчыны.**

Асаблівае значэньне набывае сіласаваньне зараз у сувязі з апошнімі пастановамі партыі і ўраду аб калгасным гандлі, аб прымусовым аграмаджаньні жывёлы і захаваньні конскага пагалоўя. Барацьба за сілас непарыўна зьвязана з выкананьнем гэтых важнейшых дырэктыў.

Ва ўмовах БССР, якая ўжо зараз мае звыш **500** жывёлагадоўчых і сьвінагадоўчых саўгасаў і тысячы малочных калгасных фэрм, у якіх сканцэнтраваны сотні тысяч буйнай рагатай жывёлы, сіласаваньне ператвараецца ў важнейшую гаспадарча-палітычную задачу.

БССР павінна ў гэтым годзе засіласаваць **1.200 тыс. тон** зялёнай масы. Нам неабходна дабівацца, каб на кожную штуку рагатай жывёлы ў саўгасах і калгасах прыпадала ня менш 3 тон сіласу. Да 1 жніўня выкананы 15 проц. усяго пляну сіласаваньня — вось задача, якая зараз стаіць перад БССР.

Тым больш недапушчальны слабы ход сіласаваньня, які наглядаецца ў важнейшых жывёлагадоўчых раёнах. На 20 ліпеня па ўсёй БССР засіласавана толькі 8.842 тоны — 0,7 проц. Зусім нездавальняюча праводзіцца сіласаваньне па ільна-малочных раёнах, дзе побач з ільном павінна разьвівацца малочная гаспадарка. Для гэтых раёнай сілас мае першачарговае значэньне, між тым, 21 раён выканаў свой плян усяго на 1 проц.

Толькі адзін **Мсьціслаўскі** раён сапраўды пачаў барацьбу за сілас (на 20 ліпеня — 7,4 проц. выкананьня пляну). **Дрысенскі** раён выканаў плян на 5,6 проц., **Лёзьнянскі** — на 5 проц. Усе астатнія ільна-малочныя раёны, як **Лепельскі, Расонскі, Сураскі, Дуброўенскі, Чашускі** ганебна плятуцца ў глыбокім тыле сіласаваньня. Гэтыя раёны нават ня выканалі і аднаго процанту заданьня.

Гаспадкі адстаюць і жывёлагадоўча буйныя раёны, у якіх сканцэнтравана найбольшая колькасьць жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў. Яны выканалі свой плян усяго на 0,5 проц. Такія раёны, як **Лагойскі, Дзяржынскі, Капыльскі, Слуцкі і Веткаўскі** амаль не пачыналі сіласаваньня.

Раёны буйнейшых пралетарскіх цэнтраў, як **Менскі, Бабруйскі, Гомельскі, Магілеўскі, Аршанскі і Віцебскі** таксама зрываюць забесьпячэньне жывёлы сакавітымі кармамі, выкапаўшы плян на 0,7 проц.

У кармовым балянсе малочна-прамысловага трэсту сілас займае значнае месца. 77.000 тон трэба закласьці ў ямы. На 20 ліпеня плян выканан на 0,9 проц. Гэта сьведчыць аб тым, што ў саўгасах Малакапрамтрэсту недаацэньваюць значэньня сіласу, што дырэкцыі саўгасаў, партыйныя ячэйкі і рабчкомы таксама, як і кіраўніцтва трэсту, ня здолелі мабілізаваць на выкананьне гэтай важнейшай задачы актыўнасьць рабочых.

Большасьць райкалгассаюзаў, райза і МТС не наладзілі апэрацыйнага кіраўніцтва сіласаваньнем. У Бягомльскім жывёлагадоўчым раёне райкалгассаюз і МТС абмежаваліся толькі тым, што давялі пляны сіласаваньня да калгасаў і па гэтым супакоіліся. У радзе месц мы наглядаем апартуністычнае супраціўленьне сіласу. Напрыклад, дырэктар саўгасу **«Палажэвічы»** заяўляе: «Мне сіласу ня трэба, хопіць і сена».

Старшыня старадароскага райкалгассаюзу тав. **Мельнік** замест мабілізацыі ўвагі калгасьнікаў і аднаасобнікаў на правядзеньне сіласаваньня, заяўляе: «Калгасы не сіласуюць, вестак не даюць, шот-ж я магу зрабіць?»

Нельга прайсьці міма таго факту, што за апошні час кармовы сэктар Наркамзему зусім аслабіў сваю ўвагу да сіласаваньня і фактычна ня кіруе гэтай справай.

Работнікі Наркамзему апраўдваюцца тым, што яны заняты складаньнем пяцігодкі, таму, моў, няма часу займацца сіласаваньнем. Мы лічым, што такое становішча надалей непярпіма.

Перадавыя саўгасы і калгасы і ў гэтым годзе на справе даказалі, што пляны сіласаваньня, вызначаныя партыяй і ўрадам зусім рэальныя. Напрыклад, калгас **«Чырвоны батрак»**, Ліхачоўскага сельсавету, Горацкага раёну ў трохдзённы тэрмін засіласаваў 25 тон, выканаўшы чэрвеньскі плян на 125 проц. Калгас **«Надубава-Чэрацянка»**, Жытковіцкага сельсавету, засіласаваў 25 тон — 25 проц. гадавога пляну. У гэтым калгасе актыўны ўдзел у сіласаваньні прынялі старшыня праўленьня тав. **Кісялёў** і жывёлавод тав. **Шакалян.** Саўгас «Уваравічы» ў мінулым годзе засіласаваў да 1.000 тон сіласу, які ахвотна паядаўся жывёлай зімой. 1 ў гэтым годзе саўгас адным з першых у раёне пачаў раньняе сіласаваньне, для правядзеньня якога вылучана спэцыяльная брыгада. На 20-га чэрвеня ў саўгасе ўжо было закладзена больш 120 тон сіласу.

За выкананьне чэрвеньскага заданьня па сіласаваньні Калгасцэнтрам БССР ужо прэміяваны калгасы Мсьціслаўскага раёну. Калгас **«Чырвоны батрак»**, Горацкага раёну, атрымаў прэмію ў **250** рублёў, калгас **«Чырвоная зерка»**, Парыцкага раёну, атрымаў таксама **250** руб. На ліпень фонд прэміяваньня вызначан у разьмеры 3.000 р.

Бліжэйшыя дэкады будуць мець рашаючае значэньне для забесьпячэньня патрэб жывёлагадоўлі ў кармох. Гэта адносіцца як да грубых, так і да сакавітых кармоў.

Раённыя арганізацыі павінны ўлічыць гэта і скарыстаць лепшы вопыт перадавікоў, перадаўшы яго ўсёй калгаснай масе. Райкалгассаюзы павінны ўстанавіць сапраўдны апэрацыйны кантроль за выкананьнем пляну сіласаваньня, даводзячы да калгасаў дэкадныя заданьні і правяраючы іх выкананьне кожныя 10 дзён.

Толькі наладзіўшы апэрацыйнае кіраўніцтва сіласаваньнем, даючы адпор апартуністам усіх колераў і мабілізаваўшы па гэту справу ўсю вясковую грамадзкасьць, мы здолеем забясьпечыць сакавітымі кармамі сацыялістычную жывёлагадоўлю.

„Хопіць сена, сіласаваць ня буду“

ГОМЕЛЬ. У мінулым годзе плян сіласаваньня быў выкананы на 50 проц. Зімой некаторыя калгасы адчувалі недахват кармоў.

У гэтым годзе Гомельскі раён павінен засіласаваць 22.672 тоны зялёнай масы. 3.400 тон (15 проц. пляну) раньняга сіласаваньня павінна быць скончана 1-га жніўня. Засіласавана-ж усяго 35 тон (калгасы «Пралетары» і «Баец»).

Райкалгассаюз абмежаваўся давядзеньнем пляну да калгасаў і на гэтым супакоўся. У выніку ёсьць выпадкі недаацэнкі сіласу і нежаданьня сіласаваць нават пры паяўнасьці ўсіх магчымасьцяй. Напрыклад, калгас «Бальшавік», Бабовіцкага сельсавету, мае 2 траншэі на 120 тон. Калгасу дадзена заданьне засіласаваць 100 тон. Старшыня калгасу тав. Драбышэўскі заяўляе: «У нас сена хопіць, сіласаваць ня буду».

Калгас «Чырвоны герой», Дзятлавіцкага сельсавету, мае сіласныя ўстаноўкі на 300 тон і шмат сіласнай масы, але да сіласаваньня не прыступае. Таксама і калгас «Чырвоны бераг», Кармалінскага сельсавету, мае ўстаноўкі на 100 тон, а сіласаваць не пачаў. Калгас «Камунар», Царэвашчанскага сельсавету, атрымаў крэдыту 4.200 руб. для сіласаваньня і расходваў іх па іншым патрэбы.

Райкалгассаюз, МТС ня прымаюць ніякіх мер для таго, каб забясьпечыць выкананьне пляну раньняга сіласаваньня.

Гомельскі гарком партыі з усяго вышэйпаданага павінен зрабіць належныя высновы.

Гасман.

ЖНІВО ЖЫТА. (Калгас «Апора саветаў», Лёзьнянскага раёну).

Аб плане завозу тавараў у раённым разрэзе па БССР

Пастанова ЦК КП(б)Б ад 23 ліпеня 1932 году

Прызнаць ход выкананьня ліпеньскага пляну завозу тавараў шырокага спажываньня ў вёску надзвычай нездавальняючым. За 20 дзён ліпеня выканана па сыстэме спажыўкаапэрацыі 48 проц. месячнага пляну.

Зусім ня выконваецца плян завозу ў вёску ільняных тканін, трыкатажу, хустак, мітак і мыла гаспадарчага.

Маюць месца факты грубага скажэньня дырэктыў партыі аб прасоўваньні тавараў у вёску па Белкаапсаюзе і Белгандлі, за што:

а) дырэктара Белгандлю—тав. Шасвіца за неаднаразовае парушэньне дырэктыў партыі аб першачарговасьці адгрузкі тавараў у вёску—неадкладна адхіліць ад работы, усклаўшы часова выкананьне абавязкаў дырэктара Белгандлю на тав. Кантона (нам. дырэктара);

б) был. загадчыку менскай базай Белкаапсаюзу—тав. Аллярэвічу за парушэньне дырэктыў партыі аб адгрузцы тавараў вёсцы—абвясьціць вымову;

в) дырэктару Прамтаварнага Аб'яднаньня Белкаапсаюзу тав. Фальковічу за няпрыняцьце рашучых мер да забесьпячэньня своечасовай адгрузкі прамтавараў паводле ліпеньскага пляну вёсцы,—абвясьціць вымову, а таксама абвясьціць вымову тав. Вайсману (лічыць адпаважаны Беларускай канторы Баўпазбыту) за тое, што не сыгналізаваў аб затрыманьні адгрузкі гэтых тавараў. Папярэдзіць, што ў выпадку паўтарэньня подобных зьявішчаў, яны будуць прыцягнуты да самай суровай партыйнай і судовай адказнасьці;

г) указаць фракцыі Белкаапсаюзу на тое, што на 1 ліпеня 1932 году рэшткі тавараў перавышаюць на 2,2 млн. руб. звыш устаноўленых максымальных разьмераў, што зьяўляецца зусім нецярпімым.

Сакратаром РК КП(б)Б Брацінскага, Жытковіцкага, Церахаўскага, Лоеўскага, Нараўлянскага, Сенненскага і Дуброўенскага раёнаў указаць на адсутнасьць барацьбы і кантролю з боку РК за шпаркім прасоўваньнем тавараў да сельгіна і дапушчэньне затаварваньня ад 30 да 64 зваротадзён.

Прапанаваць тав. Хаскіну (Белкаапсаюз) і сакратаром РК КП(б)Б пад іх асабістую адказнасьць забясьпечыць у дэкадны тэрмін скарачэньне таварных рэшткаў да устаноўленых максымальных разьмераў. Выявіць канкрэтных вінаватых, якія дапусьцілі перавышэньне таварных рэшткаў, прыцягваючы іх да адказнасьці аж да зьняцьця з работы і аддачы пад суд.

ЦК КП(б)Б патрабуе ад усіх партарганізацый пад адказнасьць сакратароў ГК і РК КП(б)Б забясьпечыць поўнае і своечасовае выкананьне пляну завозу тавараў у вёску і ўстанавіць неаслабны нагляд за прасоўваньнем тавараў шырокажыву па кожным сельспажытаварыстве ў паасобку.

ЦК КП(б)Б абавязвае ўсе партарганізацыі забясьпечыць выразнае ажыцьцяўленьне не дырэктыў партыі аб разгортваньні савецкага і калгаснага гандлю і прасоўваньні прамтавараў у вёску, бязьлітасна прыцягваючы вінаватых у парушэньні гэтых дырэктыў да самай строгай партыйнай і судовай адказнасьці з апублікаваньнем у друку.

Вучэньне Маркса-Леніна—у масы

65 год прайшло са дня выхаду ў сьвет геніяльнейшага твораньня чалавечай мысьлі — «Капіталу» Маркса. Вялізарнейшая сусьветна-гістарычная заслуга Маркса ў тым, што ён навукова ўгрунтаваў няминучасьць краху капіталізму, няминучасьць пераходу чалавецтва ад капіталізму да камунізму праз абвостраную клясавую барацьбу, праз дыктатуру пралетарыяту. **«Вучэньне Маркса ўсясільна таму, што яно праўдзівае. Яно поўнае і стройнае, даючы людзям цэльнае сьветасузіраньне, непрымірымае ні з якімі забабонамі, ні з якой рэакцыяй, ні з якой абаронай буржуазнага ўціску»,** — пісаў Ленін.

Вучэньне Маркса аўладала дзесяткамі мільёнаў сэрц пралетараў па ўсім сьвеце, таму, што яно **адзіна правільнае вучэньне,** таму што Маркс апіраўся пры яго распрацоўцы на моцны фундамант чалавечых ведаў, заваяваных пры капіталізьме, вывучыўшы законы разьвіцьця чалавечага грамадзтва. Усё, што было да яго створана ў галіне грамадзкіх навук лепшымі розумамі чалавецтва, Маркс крытычна пераапрацаваў, праверыўшы на рабочым руху. Адсюль ён зрабіў свае навуковыя выводы аб **законах разьвіцьця і пагібелі капіталізму.**

Цяжкой усяго свайго жыцьця, у гераічнай бязупынкай працы Маркс выкаваў непераўзыдзеную ідэйную зброю для рэвалюцыйнага пралетарыяту. Многа дзесяткаў год бясьсільна памагаліся буржуазныя эканамісты, прабуючы ў сваіх бяздарных, пошлых «працах» «абвергнуць», перакуліць гранітны будынак тэорыі Маркса. Нямала «напрацавалі» апартуністы, рэпэгаты марксызму, у першую чаргу ненавісны Кауцкі, каб фальсыфікаваць вучэньне Маркса, не саромячыся часам жульніцкіх падробак, каб вытруціць жывую душу марксызму — вучэньне аб дыктатуры пралетарыяту.

Але нікоўі яшчэ не даходзілі сацыял-фашысты да такой цынічнай зьвярынай злосьці да вучэньня Маркса, як зараз. Бясьсільле, імпатэнтнасьць, замяшанасьць буржуазнай навукі перад тварам сусьветнага крызісу суправаджаецца шалёным цкаваньнем марксызму.

Пралетарыят СССР, які кіруецца ленінскай партыяй, дабіўся вялізарнейшых, рапаючых перамог сацыялізму толькі таму, што ён узброен перадавой рэвалюцыйнай тэорыяй марксызму-ленінізму. Рэвалюцыйны энтузіязм, клясавае пачуцьцё, бальшавіцкая палкасьць, гарачая вера ў перамогу нашае справы падмацоўваюцца і павялічваюцца **даніадным веданьнем таго, што ўвесь ход разьвіцьця гісторыі чалавечага грамадзтва за нас, за нашу клясавую праўду.**

Крах капіталізму няминучы, і гэта наша навуковае прадбачаньне кожны дзень падмацоўваецца новымі і новымі фактамі эканамічнага і палітычнага крызісу, што бушуе ў капіталістычных краінах. Але гэты крах зусім не адбудзецца аўтаматычна, сам сабой, самацёкам, таксама як ня могуць быць вырашаны «самацёкам» і задачы сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР.

Ленін і Сталін заўсёды падкрэсьлівалі ролю суб'ектыўнага фактару ў рэвалюцыйнай барацьбе, ролю жывых людзей, ролю арганізацыі гэтых жывых людзей пад лёзунгамі партыі. **Адсюль выцякае вялізарнейшае значэньне добрапастаўленай арганізацыйна-партыйнай работы і масавай палітычнай растлумачальнай работы, масавай агітацыі, якая пазінна даходзіць да кожнага рабочага, да кожнага калгасьніка.**

Мы не павінны ні на хвіліну забываць дасканалага, клясычнага па сваёй глыбіні, моцы і яснасьці ўказаньня Маркса, што **«тэорыя становіцца матар'яльнай сілай, як толькі яна аўладоўвае масамі».** Лёзунгі нашай партыі, выпрацаваныя на аснове марксыцка-ленінскага аналізу падзей, аўладоўваюць масамі і ператвараюцца ў **гіганцкую матар'яльную сілу.**

Зараз, у сувязі з сусьветна-гістарычнымі задачамі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ў другой пяцігодцы, **сацыялістычнае выхаваньне мас,** перапрацоўка сьвядомасьці людзей высоўваецца на першы плян з новай сілай. **На базе росту і ўмацаваньня сацыялістычнай эканомікі НОВЫЯ** пласты ўзнімаюцца да актыўнага палітычнага жыцьця, растуць запатрабаваньні мас, іх палітычная сьпеласьць. Зараз як ніколі мы маем асабліва спрыяючую глебу для разгортваньня масавай работы.

Вазьмеце, напрыклад, калгасьніка. Часта пасьля цяжкага працоўнага дня ўборкі брыгады калгасьнікаў зьбіраюцца, каб падвесьці вынікі, зьнішчыць недахопы, непаладкі ў арганізацыі працы. І трэба сказаць, што дасна масавая агітацыйная работа і ў горадзе, і асабліва на вёсцы яшчэ вельмі адстае ад гэтай узросшай актыўнасьці. Даволі прывесьці такі факт, што **апошнія пастановы партыі і ўраду па пытаньнях калгаснага гандлю і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў ва многіх калгасах яшчэ не даведзены па-сапраўднаму да мас.**

Людзі забываюць, што растлумачэньне гэтых пастаноў зьяўляецца зараз **важнейшым** зьвяном сацыялістычнага перавыхаваньня калгасьніка, адным з вагароў барацьбы за скалачасовую, бяз страт уборку ўраджаю, якая ў значнай ступені будзе вырашаць посьпех усяго гаспадарчага пляну.

Растлумачыць калгасьніку яго непасрэдную матар'яльную зацікаўленасьць у барацьбе са стратамі, правільна правесьці разьмеркаваньне авансаў, аддаць больш увагі патрабаваньням калгасьніка, дапамагчы яму ўзьняць дадатковую, дапаможную гаспадарку (карова, дробная жывёла, птушка, город і г. д.), — усё гэта важнейшыя чарговыя задачы партыйных і камсамольскіх ячэек у вёсцы.

У горадзе мы таксама яшчэ не ахопліваем сваім палітычным уплывам, сваёй масавай работай кожнага рабочага. Спротчасьць, прымітыўнасьць, сухія даклады, якія ня выклікаюць жывой зацікаўленасьці, не даюць адказу на вострыя пытаньні, аслаблеьне ўвагі да індывідуальнай адукацыі, — такавы недахопы масавай работы ва многіх арганізацыях.

Каб узьняць агітацыйна-прапагандысцкую работу на нязьмерна больш высокую ступень, адпаведную ўзроўню нашых задач, **трэба павысіць ідэйна-палітычную ўзброенасьць партыйных і камсамольскіх ячэек.**

«Калі сельская або калгасная ячэйка бальшавікоў ідэйна слаба ўзброена, і не адыгрывае ролі арганізатара, агітатара, то ў калгасе парадку ня будзе.

Задача ўздыму ідэйна-тэарытычнага ўзроўню камуністаў і камсамольцаў, у першую чаргу партактыву, зараз стаіць востра» **(Л. М. Кагановіч).**

Нельга забываць, што кожная партыйная ячэйка — жывы арганізм, які павінен жыць ідэйным жыцьцём партыі і штодзенна павышаць палітычны ўзровень сваіх членаў, узьнімаючы любое практычнае пытаньне па палітычную вышыню.

Сучасная міжнародная абстаноўка і новыя задачы сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне патрабуюць ад усіх партыйных арганізацый **узмацненьня ўвагі да пытаньняў ідэйнай узброенасьці партыйцаў і камсамольцаў марксыцка-ленінскай тэорыяй.**

Мы перажываем шчасьлівы час, калі вялікае навуковае прадбачаньне Маркса аб краху капіталістычнай сыстэмы вытворчасьці збываецца на нашых вачох, калі блізка эпоха канчатковага вызваленьня чалавецтва ад ярма экспляётацыі.

Напомнім прароцкія словы Маркса, напісаныя 65 год назад у «Капітале», але цалкам прыстасоўныя і да сучаснага гістарычнага этапу разьвіцьця капіталістычнага сьвету:

« ... Расьце маса галечы і ўціску, падзяволеньня, выраджэньне і экспляётацыі, але разам з тым расьце і абурэньне рабочай клясы, якая бязупынна павялічваецца, вышкаленай, аб'яднанай і арганізаванай самым мэханізмам капіталістычнага працэсу вытворчасьці. Манаполія капіталу робіцца кайданамі таго спосабу вытворчасьці, які разам з ёю і дзякуючы ёй дасягнуў росквіту. Цэнтралізацыя сродкаў вытворчасьці і аграмаджэньне працы дасягаюць узроўню, пры якім яны робяцца несумяшчальнымі з іх капіталістычнай абалонкай. Апошняя разрываецца. Б'е гадзіна капіталістычнай прыватнай уласнасьці. Экспрапрыятараў экспрапрыююць».

Марксызм — ня догма, а кіраўніцтва да рэвалюцыйнага дзейства. Вучэньне Маркса-Леніна — у масы!

(«ПРАВДА»).

Падрыхтоўка да навучальнага году

...Шукаюць клей, а ён пад бокам

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Мінулы навучальны год у раёне прайшоў са значнымі посьпехамі перабудовы работы ў адпаведнасьці з пастановай ЦК партыі аб школе. Павышана якасьць вучобы. Пасунута наперад справа політэхнізацыі. У гэтым асаблівую ролю адыграла актыўная дапамога школе прамотарскай грамадзкасьці і кіраўніцтва буйнейшых прадпрыемстваў Барысаўшчыны.

У мінулым годзе ахоплена было вучобай 98 проц. дзяцей па горадзе і 96,8 проц. па раёне. Для дзяцей працоўных нацменшасьцяй існуюць — польская 4-камплектная школа (Лозінскі сельсавет), яўрэйская сямігодка, літоўская і латыская школы (Глівенскі сельсавет). З лютага месяца адкрыта пры Стара - Барысаўскай фэрме БКС нямецкая школа. Пры 15-й школе працуюць 2 групы на расійскай мове.

Сёлета ў параўнаньні з мінулымі гадамі значна эмяншана колькасьць другагодніка, што сьведчыць аб павышэньні якасьці работы школ.

Крыху больш чым праз месяц пачнецца новы навучальны год. Зараз неабходна энэргічная падрыхтоўчая работа: своячасовае скампляктаваньне новага будаўніцтва, рамонту, падрыхтоўка інтэрнату, забесьпячэньне школ падручнікамі, дэтальная апрацоўка праграм і г. д. Між тым, падрыхтоўка асабліва ў галіне будаўніцтва і рамонту школ праходзіць дрэнна. Сельсаветы не праяўляюць належнай ініцыятывы для адпуканьня на мясцох патрэбных будматар'ялаў. Мясцовымі работнікамі шмат траціцца часу на паездкі ў раённы цэнтр для «ўзгадненьня пытаньняў» аб цэгле, цэмэнце, крэйдзе і інш., а рамонт і будаўніцтва адстаюць.

— Парайце, дзе клею здабыць! — звяртаецца настаўнік Веляніцкага сельсавету да работнікаў раёна.

Тады яму адзін раіць паехаць у Менск, другі запэўнае, што клей можна дастаць толькі ў Маскве. Людзі «разважаюць», людзі шукаюць рукавіцы за поясам... Гэта ў той час, калі клей ёсьць у самым Барысаве, толькі яго трэба атрымаць арганізаваным парадкам, праз адпаведныя ўстановы.

Пэрспэктывы завяршэньня пабудовы школ у раёне даволі сумныя. З 5-ці аб'ектаў, якія павінны быць пабудаваны да пачатку вучобы, толькі чатыры школы магчыма будуць скончаны. Пяты-ж аб'ект — школа ў Блоні, Жыткаўскага сельсавету, «будуецца »з 1928 году. Вярней, ня будуюцца, а гніюць выведзеныя пад дах сьцены.

Частка настаўнікаў, асабліва тых, якія працуюць у вёсцы, ахоплена нездаровым настроем — пакінуць работу.

Зразумела, з такімі дэмабілізацыйнымі настроямі, лятуцтвам трэба рашуча змагацца ня толькі адміністраваньнем, а палепшэньнем матар'яльна - бытавых умоў асьветнікаў. **У Барысаўскім раёне ў гэтых адносінах ня ўсё добра.** У радзе сельсветаў наглядаюцца вельмі няўважлівыя адносіны да настаўніцтва з боку мясцовых органаў. Ёсьць перабоі ў забесьпячэньні хлебам. У **Веляніцкім** сельсавеце выдалі гнілыя крупы. У **Лошніцкім** сельсавеце сыстэматычна разбазарваліся прадуктовыя фонды, вызначаныя для настаўнікаў. У **Жыцькаўскім і Баранскім** сельсаветах на працягу 3-х месяцаў ня выплачвалася зарплата. Некаторыя настаўнікі і да гэтага часу не атрымалі пэнсіі на час адпачынку.

Такое зьявішча можна характарызаваць адным словам — злачынства, якое нічым і ні ў якой меры ня можа быць апраўдана.

Наша школа — важнейшы вучастак культурнага будаўніцтва, наша школа зьяўляецца адным з важнейшых ачагоў камуністычнага выхаваньня. На гэты фронт імкнецца накіраваць свае сілы недабіты клясавы вораг. Таму неабходна партыйнай арганізацыі раёну большую ўвагу аддаць школе, павысіць клясавую пільнасьць да ўсялякіх прошукаў клясавага ворага і ўсялякіх спроб апартуністычных элемэнтаў скажаць дырэктывы партыі на культурным фронце.

Я. Івашын.

РАЎНЯЦЦА ПА ПЕРАДАВІКОХ

Лепшыя ўдарнікі фінфронту—камсамольцы--прэміяваны

Адзначаючы, што рад камсамольскіх арганізацый і паасобныя камсамольцы паказалі добрыя прыклады баявой бальшавіцкай работы на фінансавым фронце, Народны Камісарыят Фінансаў БССР і ЦК ЛКСМБ пастанавілі адпусьціць у распараджэньне загадчыкаў райза, гарфа, РК і ГК ЛКСМБ для прэміраваньня камсамольцаў—перадавых актывістаў фінансавай работы: **Заслаўскаму раёну—700 р., Гомельскаму — 1.800 руб., Жыткавіцкаму—700 руб., Тураўскаму —700 руб. і Старобінскаму—500 руб.**

Прэміраваны таксама наступныя камсамольскія і піянэрскія калектывы: **Шчацінная фабрыкі** (Віцебск) у суме 350 руб., **камсамольская брыгада друкарні імя Сталіна** (Менск)—**300 руб., піянэрбаза фабрыкі імя Халтурына** (Віцебск) — **250 руб.**

Пэрсанальна прэміраваны камсамольцы: **Жураўлікіна**—работніца мэблевага цэху фабрыкі **«КІМ»** (Віцебск) **у суме 150 руб.,** Давідоп—рабочы-вылучэнец, намесьнік загадчыка цэху фабрык **«Прафінтэрн»—100 руб., Сьвяцкі**—рабочы заводу **«Чырвоны мэталіст»** (Віцебск)—100 руб., **Дзядзелева**—работніца фабрыкі «Дзьвіна» (Віцебск)—100 руб., **Катнёва** — машыніст паравоза № 317 МБВ (Віцебск) прэміравана граматай Наркамфіну БССР; **Сілікаў М. М.**—калгасьнік **Курмаўскага сельсавету,** Мсьціслаўскага раёну—100 руб., **Крывалава**—калгасьніца калгасу імя Чарнікова, Мсьціслаўскага раёну—150 руб., **Ганкін**—рабочы бабруйскага дрэвапрацоўчага камбінату — 100 руб., **Клоцко**—работніца бабруйскага дрэвапрацоўчага камбінату—100 руб., **Зобіна**—работніца фабрыкі імя 8 сакавіка (Менск)—100 руб., **Амбразевіч**—рабочы заводу імя Варашылава—100 руб., **Крывашэін**—рабочы заводу імя Варашылава—150 руб., **Кайтман**—рабочы заводу «Бальшавік» (Менск)—150 руб., **Батурына**—работніца заводу «Бальшавік»—100 руб. і **Рыўкіна**—работніца заводу «Бальшавік»—150 руб.

Усім прэміраваным таварышом будзе выдана грамата **«Ударнік фінфронту».**

Рэалізацыя пазыкі „Чацьверты завяршальны"

(Па калгасным сэктары на 20 ліпеня 1932 г.)

Ідуць упередзе:

1. Клімавіцкі раён — 121 проц.
2. Мсьціслаўскі раён — 115,3 проц.
3. Аршанскі раён — 98,3 проц.
4. Крычаўскі раён — 98,3 проц.
5. Сіроцінскі раён — 97,8 проц.
6. Дзяржынскі раён — 94,0 проц.
7. Віцебскі раён — 91,4 проц.
8. Лагойскі раён — 86,6 проц.
9. Менскі раён — 76,4 проц.
10. Слуцкі раён — 75,2 проц.
11. Буда-Кашалёўскі раён — 75,0 проц.

Ганебна адстаюць:

1. Сеньненскі раён — 17,5 проц.
2. Чашніцкі раён — 16,9 проц.
3. Асьвейскі раён — 16,7 проц.
4. Прапойскі раён — 14,9 проц.
5. Чачэрскі раён — 13,2 проц.
6. Бешанковіцкі раён — 12,5 проц.
7. Уваравіцкі раён — 9,0 проц.
8. Хойніцкі раён — 7,0 проц.

УВАГА: Астатнія раёны даюць сярэдніх лічбы выкананьня.

ДРОВЫ—МЕНСКУ

Абломаўшчына ў працы Менгартопу—прычына прарыву

Даставіць своячасова патрэбную колькасьць дроў гораду—значыць забясьпечыць нармальную работу прадпрыемстваў, савецкіх навучальных і бытавых устаноў, ацяплець кватэры рабочых і служачых. Вось чаму даны вучастак работы патрабуе выключнай увагі ня толькі лесазагатоўчых арганізацый, але і арганізацый рэйнаў, гарадоў і транспарту.

Партыя і ўрад, надаючы вялізарнае значэньне гэтаму пытаньню, арганізавалі ў буйных гарадох спэцыяльныя ўстановы—гартопы, на якія ўскладзена непасрэдная адказнасьць за снабжэньне гарадоў апалам. Па лініі Лесбелу, Лесаснабзбыту, гарсаветаў, РВК і чыгунак даны жорсткія дырэктывы аб ударным фарсаваньні вывазкі дроў з лесу і дастаўкі іх да гарадоў.

Аднак, вынікі работы за першыя два кварталы сьведчаць аб недапушчальна-нарудным ажыцьцяўленьні дырэктыў, даных ЦК і СНК. Асабліва ганебнае адставаньне мы маем па снабжэньні дровамі Менску. Паводле плану Лесаснабзбыту і Менгартопу, Менск да 1 ліпеня павінен быў атрымаць 217 тыс. раўмэтраў дроў, або 51 проц. гадавой праграмы. Фактычна-ж завезена толькі 120 тыс. раўмэтраў, або 28,5 проц.

Такія абломаўскія тэмпы работы тлумачацца, галоўным чынам, адсутнасьцю гібкага і аператыўнага кіраўніцтва дастаўкай дроў як з боку лесправгасаў, якім даны пэўныя заданьні, так і з боку самога Менскага гартопу. Той факт, што на сёньняшні дзень гартоп ня мае дакладнага ўліку, польні і які лесправгас даставіў для Менску дроў, сьведчыць аб поўнай бездапамочнасьці за даручаны вучастак работы з боку яго кіраўніцтва.

Трэба адзначыць, што ня ўсе сельсаветы перабудавалі сваю работу адпаведным чынам. Побач з цэлым радам прыкладаў узорнай работы паасобных сельсаветаў, мы таксама маем значную колькасьць прыкладаў недапушчальнага адміністраваньня, парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці, страты клясавай пільнасьці з боку паасобных работнікаў сельсаветаў. Па гэты бок справы трэба зьвярнуць самую сур'ёзнейшую ўвагу і прыняць рашучыя крокі да таго, каб вывесьці бязьлітасна зьнішчыць гэтыя антыленінскія, варожыя самай сутнасьці савецкай улады, ганебныя зьявішчы.

Трэба ўвесьць палітычнае значэньне, ардынізуючую ролю сельсаветаў, замацаваць іх сувязь з масамі калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкага аднаасобнага сялянства, рабочых, праз замацаваньне дэпутацкіх груп, ажыўленьне работы сэкцый, дэпутацкіх груп, праз разгортваньне сацыялістычных мэтадаў работы, перанясеньне лешных прыкладаў работы ва ўсе сельсаветы.

Трэба цалкам ажыцьцявіць лёзунг «узьняць ролю саветаў у барацьбе за генэральную лінію партыі».

Асабліва важную ролю павінна адыгрываць справа стварэньня пастаянных кадраў у раёне, сельсавеце, саўгасе і калгасе. Толькі пры наяўнасьці гэтых кадраў магчыма сапраўды забясьпечыць кіраўніцтва па месцы. Толькі ў гэтым выпадку будзе забясьпечан рост і высоўваньне мясцовых работнікаў, значна зьменшыцца іх цякучасьць, толькі гэта будзе зьяўляцца гарантыяй далейшага магутнага прытоку перадавых людзей з рабочае клясы і калгаснага сялянства ў рады камуністычнай партыі і камсамолу.

У час веснавой пасеўнай кампаніі, як і на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, мы сустрэліся з жорсткай барацьбой рэшткі кулацтва і іншых клясава-варожых элемэнтаў, якія змагаючыся супроць улады саветаў, накіроўвалі сваю барацьбу ў бок разбурэньня калгасаў, зрыву плянаў веснавой пасеўнай кампаніі. Мы бясспрэчна сустрэнемся з жорсткім супраціўленьнем гэтых клясавых ворагаў працоўных і ў час уборачнай кампаніі. Клясавы вораг ня спыніў сваёй барацьбы супроць сацыялістычнага будаўніцтва. Кулак, гандляр, поп і іх хаўрусьнікі з былых прывілеяваных клясаў бачаць сваю нямінучую згубу ад посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва, ад стварэньня і ўзмацненьня калгасаў, ад ліквідацыі кулацтва як класы на аснове суцэльнай калектывізацыі. І таму гэтыя асколкі мінулага прымаюць усе меры да барацьбы супроць савецкай улады і яе мерапрыемстваў. На кожным новым этапе контр-рэвалюцыйная барацьба клясава - варожых элемэнтаў прымае новыя формы і новую афарбоўку, але контр - рэвалюцыйная сутнасьць гэтай барацьбы застаецца нязьменнай. **Свалаасаблівасьцю гэтай контр-рэвалюцыйнай барацьбы з боку клясава-варожых элемэнтаў на даным этапе зьяўляецца тое, што выяўлены, раскрыты, страціўшы свае ўпісы ў вёсцы кулак ужо баіцца выступаць адкрыта, і імкнецца прыкрыць сваю шкодніцкую работу хлусьнёй, правацыяй і ашуканствам несьвядомай часткі нашай вёскі.**

Будучы ў часе веснавой пасеўнай кампаніі ў цэлым радзе раёнаў, я сам сустрэўся з такімі фактамі, што кулацтва і яго агэнтура, вядучы барацьбу супроць калектывізацыі, супроць трэцяй бальшавіцкай вясны, супроць улады саветаў, распускала чуткі аб тым, што я, як быццам, прыехаў у раён для таго, каб распускаць і разганяць калгасы. Гэта сьвядомае ашуканства і злосная правакацыя распускаюцца ворагамі працоўных для таго, каб скарыстаць несьвядомую частку вёскі для разбурэньня калгасаў; гэтымі чуткамі кулакі і заможнікі імкнуцца затрымаць уступленьне бядняцка-серадняцкіх мас вёскі ў калгасы, падарваць веру настойлівых калгасьнікаў у калгаснае будаўніцтва, дэзарганізаваць калгасы знутры, каб іх развяліць.

Кулак і заможнік добра разумеюць, што суцэльная калектывізацыя, арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў канчаткова зьнішчае беднасьць, зьнішчае кулацкую кабалу, ліквідуе кулацтва як клясу і самыя падставы для эксплёатацыі чалавека чалавекам. Кулакі імкнуцца сарваць калгаснае будаўніцтва. Вось чаму выхад з калгасаў, развал калгасаў, разбурэньне калгасаў — ёсьць справа клясавага ворага, накіраваная супроць інтарэсаў працоўных, супроць улады саветаў.

Той, хто сапраўды жадае дабра бядняцка-серадняцкаму сялянству, хто сумленна жадае ісьці пад сьцягам нашага вялікага правадыра і настаўніка Уладзімера Ільліча Леніна, павінен ведаць, **што адзіны шлях, які канчаткова зьнішчае беднасьць і кулацкую кабалу, ёсьць шлях сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, праз утварэньне саўгасаў і калгасаў.**

Мы павінны яшчэ больш узьняць нашу клясавую пільнасьць, разгарнуць арганізацыйна - масавую работу, узьняць палітычную сьвядомасьць, культурны ўзровень мас для таго, каб на падставе рашучага змаганьня за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, дружным і пасьпяховым правядзеньнем уборачнай кампаніі, даючы свазчасовы і руйнуючы адпор усім клясавым ворагам і кожнай кулацкай правакацыі, змацаваць дасягнутыя посьпехі ў калгасным руху і забясьпечыць ажыцьцяўленьне суцэльнай калектывізацыі ў тэрміны, вызначаныя ЦК УсеКП(б).

Савецкая Беларусь мае ўсе гаспадарчыя і палітычныя ўмовы для поўнага ажыцьцяўленьня гэтай задачы.

Я павінен з вялікім задавальненьнем адзначыць, што асноўныя масы калгасьнікаў і бядняцка - серадняцкае сялянства Савецкай Беларусі не даюць веры хітрыкам клясавых ворагаў, дапамагаюць нам выкрываць тых, што распаўсюджваюць такія чуткі і ў адказ на правакацыю кулакоў яшчэ больш рашуча змагаюцца за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за разгортваньне калгаснага руху, за канчаткову ліквідацыю кулацтва як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі.

Таварышы! Пастановы 3-яй сэсіі ЦВК — гэта заклік Савецкай улады да ўсяго калгаснага сялянства, да ўсіх працоўных Савецкай Беларусі яшчэ больш узьняць тэмпы на пасьпяховае выкананьне гэтых задач.

Уся наша работа павінна адбывацца на аснове рашучага змаганьня за генэральную лінію партыі. Правы апартунізм, зьяўляючыся агэнтурай кулацтва ў партыі, працягвае заставацца галоўнай небясьпекай на даным этапе. Нашы саветы павінны быць ачышчаны як ад праваапартуністычных элемэнтаў, так і ад «левых» загібшчыкаў, павінны весьці рашучую барацьбу супроць прыміранчых адносін да ўсялякіх праяўленьняў апартунізму.

Пастановы 3-яй сэсіі ЦВК трэба прапрацаваць на пленумах саветаў, папыраных сходах рабочых, калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкага сялянства.

Трэба скарыстаць гэтыя пастановы для таго, каб яшчэ больш узброіць працоўныя масы Савецкай Беларусі для рашучага змаганьня, пад кіраўніцтвам камуністычнай парты

КЛЯСАВЫЯ БАІ У ПОЛЬШЧЫ АБВАСТРАЮЦЦА

ВАРШАВА. На наступленьне прадпрыемцаў на зарплату і на рэшткі заваяваньняў рабочай клясы пралетарыят Польшчы пад кіраўніцтвам КПП, адказвае контр-наступленьнем. У апошнія часы з новай сілай пракацілася забастовачная хваля па ўсёй Польшчы. Забастовачныя баі носяць усё больш бурны характар і адзначаюцца сваёю масавасьцю і зацятасьцю. Становяцца ўсё больш частымі выпадкі **захопу бастуючымі рабочымі фабрык і заводаў** і крывавай барацьбы з паліцыяй. **Так, у Заверці,** на фабрыцы Гульдучынскага бастуючыя рабочыя ўжо 4 тыдзень адбіваюць атакі ўзброенай да зубоў паліцыі.

У **Пабіяніцах** (Лодзінскае ваяводзтва) на тэкстыльнай фабрыцы Крушэ і Эндэр, ня гледзячы на паліцэйскі тэрор і здрадніцкую тактыку нэпэсэўцаў, рабочыя бастуюць далей. Як вядома, 15-га ліпеня паліцыя напала па бастуючых, якія захапілі фабрыку і **зрабіла ім крывавую лазьню. Барыкадныя баі** паміж рабочымі і паліцыяй **працягваліся,** як прызнае нават фашысцкая праса, **да гадзіны ночы.** Для ачышчэньня фабрыкі ад бастуючых рабочых у ход былі ўшчаны кулямёты і сьлёзатачывыя газы. Ліка рабочых была паранена, а звыш 60 чал. арыштавана, прычым, як сьцьвярджае эндэцкая «Газэта Варшавска № 214, **некалькі рабочых адданы ваенна-палявому суду.**

Ужо каля месяца працягваецца забастоўка бедастоцкіх тэкстыльшчыкаў. У Лодзі бастуюць рабочыя па вырабу вопраткі. Рабочыя **нафтавай прамысловасьці** на агульным сходзе ў Барыславе пастанавілі, у выпадку далейшага зьніжэньня зарплаты, **абвясьціць усеагульную забастоўку.**

Клясавыя баі ў фашысцкай Польшчы, ня гледзячы на страшэнную галечу працоўных мас, набываюць усё больш масавы характар. Паліцэйскі тэрор ня толькі ня ў стане зламіць супраціўленьне бастуючых рабочых тэй ці іншай фабрыкі, але наадварот, выклікае яшчэ большую згуртаванасьць, нянавісьць да сваіх эксплёататараў.

Расьце і ўмацоўваецца і фронт салідарнасьці паміж пралетарамі гораду і працоўным селянствам. У Беластоку ваколічнае селянства дапамагае бастуючым тэкстыльём усім, чым толькі можа, і заклікае іх змагацца да поўнай перамогі.

Забастовачная хваля бурліць. Раскаты надыходзячай рэвалюцыйнай буры чутны ва ўсіх канцох фашысцкай Польшчы.

Бурныя дэманстрацыі пратэсту ў Перамышлі

22 лютага, у сувязі з ваенна-палявым судам над 4-мя рэвалюцыйнымі селянамі ў Саноку, працоўныя масы ў Перамышлі наладзілі бурную дэманстрацыю перад будынкам мясцовага акруговага суда. **Каменьнямі былі выбіты ўсе вокны.** Значны паліцэйскі атрад разагнаў рабочых, прычым **шмат дэманстрантаў было арыштавана.**

За лоўлю вудачкай рыбы ў панскім возеры—памешчык ломіць селянам ногі

ВІЛЬЦЯ Для характарыстыкі таго памешчыцкага свавольля, якое зараз пануе ў фашысцкай Польшчы, і асабліва на Зах. Беларусі, зьяўляецца наступны факт:

Уласьнік млыну ў калёніі **Свэндова,** Браташэвіцкай воласьці, Бжэзінскага павету, злавіўшы 4-селян з ваколічных вёсак, якія лавілі вудачкамі рыбу ў яго возеры, **зьбіў іх да крыві, аднаму хлапцу паламаў ногі, і потым адвёз іх на пастарунак паліцыі ў м. Стрыкаве, дзе іх пасадзілі ў турму.** Вестка аб гэтым выклікала вялізарнае абурэньне сярод ваколічных селян.

Праз некалькі дзён гэты-ж уласьнік возера злавіў нейкага селяніна **Ф. Казлоўскага** з вёскі Глоўна, які лавіў вудачкай рыбу **Уласьнік зьбіў яго да страты прытомнасьці, а потым зьвязаўшы, адвёз у паліцыю і кінуў у турму.**

Вестка аб гэтым маланкай разьнеслася па ваколічных вёсках. Вялізарны натоўп селян асадзіў пастарунак паліцыі ў Стрыкаве, дамагаючыся вызваленьня арыштаваных памешчыкам селян і расправы над апошнім.

Паліцыя прыкладамі разагнала дэманстрантаў. Праз некаторы час селяне зноў сабраліся і **атакавалі пастарунак паліцыі.** На стрэлы паліцыі натоўп адказаў градам каменьняў. **Пастарунак быў разгромлен, уласьнік млыну быў выцягнуты адтуль і натоўп зрабіў над ім самасуд.**

АБ ПРАВЯДЗЕНЬНІ ЎСЕБЕЛАРУСКАГА РЭЙДУ

РК і РКК КП(б)Б, рэдакцыям гарадзкіх, раённых і шматтыражных газэт БССР

9 жніўня 1932 г. спаўняецца 15 год са дня заснаваньня газэты Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б — «Зьвязды» і пяцігодзьдзе пераводу яе на беларускую мову.

ЦК КП(б)Б надае юбілею газэты «Зьвязда» — нястомнага змагара за генэральную лінію партыі — надзвычай важнае палітычнае значэньне.

Юбілей газэты ЦК КП(б)Б «Зьвязда» павінен яшчэ больш мабілізаваць нізавы друк і армію рабселькораў на далейшую няўхільную барацьбу на два фронты за генэральную лінію партыі, супроць правага ўхілу — галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць загібаў і прымірэнцтва да ўхілаў, за няўхільнае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі, супроць шавінізмаў усіх колераў, супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму — галоўнай небясьпекі.

Юбілей «Зьвязды» павінен яшчэ больш мабілізаваць наш друк і рабселькораў на барацьбу за ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны, за выкананьне і перавыкананьне ўсіх якасных і колькасных паказальнікаў прамфінпляну, за павялічэньне вырабу прадметаў шырокага спажываньня, за сэкачасовую ўборку ўраджаю, за скарочаныя тэрміны і якасьць уборкі, за разгортваньне калгаснага гандлю, за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў — цэнтральную задачу калгаснага будаўніцтва на даным этапе.

У часе рэйду асаблівую ўвагу зьвярнуць на ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўлады, накіраваных на самае строгае правядзеньне рэвалюцыйнай законнасьці. Дырэктыва партыі аб тым, што трэба «пасьлядоўна ажыцьцяўляць указаньні партыі аб самай суворай адказнасьці камуністаў за малейшую спробу парушэньня законаў» павінна стаць у цэнтры ўвагі пры правядзеньні рэйду. Шляхам бальшавіцкай самакрытыкі рашуча выкрываць усе лякія спробы клясавых ворагаў і яго агентуры—правых і «левых» апартуністаў, якія імкнуцца перашкодзіць пераможнаму наступленьню сацыялізму па ўсім фронце.

Друк БССР павінен адзначыць юбілей «Зьвязды» далейшым шырокім разгортваньнем масавай работы сярод рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў.

У сувязі з юбілеем, па пастанове ЦК КП(б)Б **З 1 ПА 10 ЖНІЎНЯ ПРАВОДЗІЦЦА ЎСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД УДАРНЫХ БРЫГАД ДРУКУ ІМЯ 15-ГОДЗЬДЗЯ «ЗЬВЯЗДЫ»** па правядзеньні рэалізацыі 9 увагі тав. Сталіна **па прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах,** разгортваньня вырабу прадметаў шырокага спажываньня, выкананьня дырэктыў партыі аб калгасным гандлі і арганізацыі сустрэчнага патоку прамтавараў.

Ператварыць рэйд ударных брыгад друку ў баявую праверку выкананьня гістарычных умоў тав. Сталіна, яшчэ вышэй узьняць творчы энтузіязм рабочых, калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў — неадкладная задача ўсяго цэнтральнага, раённага і нізавога друку БССР.

Рэйды ўдарных брыгад друку праводзяцца непасрэдна на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах.

Для падрыхтоўкі кіраўніцтва непасрэдным правядзеньнем рэйду, пры рэдакцыях гарадзкіх і раённых газэт неабходна стварыць штаб. У склад штабу ўваходзяць прадстаўнікі РК КП(б)Б, райКК-РСІ, мясцовай газэты, РК ЛКСМ, райпрафсавету, райкалгассаюзу.

Штабы на аснове выпрацаванай рэдакцыяй газэты «Зьвязда» падрабязнай праграмы рэйду складаюць календарныя планы правядзеньня рэйду па прадпрыемствах, саўгасах, калгасах, МТС і г. д., спікаючы па даручэньні райкому партыі разам з рэдакцыяй раённай газэты нарады рабселькораў і кіруюць апэрацыйнай работай у часе правядзеньня рэйду.

Рэкамэндуецца да кожнага прадпрыемства прымацаваць адказнага прадстаўніка штабу, які б непасрэдна на месцы практычна дапамог ударным брыгадам друку ў правядзеньні іх работы і папярэднім іх інструктаваньні.

Для кіраўніцтва правядзеньня на мясцох рэйду неабходна ў сельсавеце накіраваць групу работнікаў з раённага актыву.

Вынікі рэйду павінны шырока асьвятляцца ў нізавым і раённым друку, а таксама і ў «Зьвязьдзе». Выключна завостраную ўвагу трэба зьвярнуць на самае шырокае скарыстаньне прапаноў рабочых, інжынэрна-тэхнічных работнікаў, гаспадарнікаў і г д., на змаганьне за дзейснасьць кожнай прапановы, кожнага зьмяшчаемага на старонках газэты допісу, узьнімаючы гэтыя пытаньні на палітычную вышыню барацьбы за дзейснасьць пралетарскай самакрытыкі.

Неабходна шырока распаўсюдзіць вопыт тых фабрычна-заводзкіх шматтыражак БССР, якія прынялі шэфства над вытворчымі прапановамі.

Рэдакцыяй газэты «Зьвязда» дасылаюцца на месцы ў дапамогу таварышом у іх рабоце па правядзеньні рэйду спэцыяльныя макеты насьценных газэт.

Гэтыя макеты насьценных газэт неабходна скарыстаць у часе рэйду і выпускаць на працягу ўсяго часу работы па правядзеньні рэйду. Рэйдавыя газэты павінны быць дазведзены да брыгады. Для гэтага раён іх выпускаць у некалькіх экзэмплярах. Раённыя газэты павінны дапамагчы брыгадам друку і ўзяць на сябе апэрацыйнае кіраўніцтва рэйдавымі газэтамі, якія павінны выходзіць пры самым заводзе, якія павінны выходзіць пры самым актыўным удзеле рэдкалегіі цэхавых і брыгадных насьценных газэт, і пад кіраўніцтвам мясцовых партыйных ячэек.

З мэтай шырокага асьвятленьня рэйду мэтагодна ўвесь матар'ял рэйду ад кожнага прадпрыемства, калгасу, саўгасу, МТС і г. д., кожнай у паасобку брыгады, не чакаючы агульных вынікаў у раённым ці заводзкім разрэзе, дасылаць у газэту «Зьвязда». Раённыя газэты і заводзкія шматтыражкі павінны стаць сапраўднымі калектыўнымі карэспандэнтамі «Зьвязды».

Вынікі пасьля сканчэньня рэйду павінны быць абгавораны на нарадах трыкутнікаў, на прадпрыемствах, на нарадах праўленьняў калгасаў і брыгадзіраў, а потым вынікі паўінны абгаварвацца на аб'яднаным пасяджэньні бюро РК і прэзыдыуму раённай кантрольнай камісіі.

Падкрэсьліваем, што посьпехі правядзеньня рэйду будуць залежыць ад грунтоўнасьці папярэдняй падрыхтоўкі, ад масавасьці ўсёй работы і ад забесьпячэньня глыбокага партыйнага кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеньнем рэйду.

Кожная газэта павінна ператварыць правядзеньне рэйду, якім пралетарская грамадзкасьць БССР адзначае 15-годзьдзе існаваньня «Зьвязды», у справу гонару кожнай газэты, кожнага рабкора, кожнага селькора-ўдарніка бальшавіцкага друку.

Культпроп ЦК КП(б)Б.
ЦКК НК-РСІ.
«Зьвязда».
«Рабселькор».

ПРАЦЭС БЕЛАБАНДЫТА ГАРГУЛАВА

Абарона дамагаецца новай экспэртызы Гаргулава

ПАРЫЖ, 25. (ТАСС). Агенцтва Гавас паведамляе: «Працэс Гаргулава, забойцы Думэра, пачаўся сёньня у 1-й гадз. дня і працягнецца тры дні. На працэсе прысутнічаюць сотні францускіх і чужаземных журналістаў, шмат адвакатаў».

ПАРЫЖ. 25 ліпеня ў судзе прысяжных пачаўся працэс Гаргулава па абвінавачаньні ў наўмысным забойстве францускага прэзыдэнта Думэра. Старшынёю суда зьяўляецца першы старшыня апэляцыйнага суда **Дрэйфус,** абвінавачвае генэральны пракурор **Пона-Гіг.** Абаронцы **Жэро, Коардэль, Рожа.**

Пасьля зачытваньня акту абвінавачаньня абарона, якая ўзяла лінію на доказ ненарчальнасьці Гаргулава, дамагаецца каб выкліканым ёю ў якасьці сьведак псыхіятрам было дазволена перагаварыць з Гаргулавым.

Суд адмовіўся задаволіць просьбу абароны на тэй падставе што закон забараняе кантакт паміж сьведкамі і падсудным.

Старшыня суда прыступае да допыту Гаргулава, пачынаючы з яго біяграфіі. Пасьля пытаньняў адносна нараджэньня, вучэньня, удзелу ў сутьветнай вайне, мэдыцынскай службе ў Лабінскай у 1918 годзе, старшыня пераходзіць да пэрыяду грамадзянскай вайны, упамінаючы аб удзеле падсудзнага ў белых арміях, у прыватнасьці ў войсках Урангеля.

Потым старшыня суду пераходзіць да 1919 г., да растоўскага пэрыяду жыцьця Гаргулава і дапытвае Гаргулава аб яго палітычнай пазыцыі ў гэты пэрыяд.

Гаргулаў адказвае, што ён 2 разы арыштоўваўся ЧК, займаўся палітыкай, быў заўсёды ворагам бальшавікоў, а таксама ворагам манархіі, якая прадала народ у часе вайны. Гаргулаў заяўляе, што ён спачуваў Керанскаму.

Старшыня паказвае Гаргулаву на паказаньні казака Лазарава, згодна якіх Гаргулаў нібы тады быў бальшавіком, амаль ня кіраўніком ЧК.

Гаргулаў з абурэньнем заяўляе, што сьведка злачынца, правакатар, падасланы манархістамі. Гаргулаў зноў гаворыць аб нянавісьці да камунізму, манархіі, аб спачуваньні Керанскаму. Гаргулаў заяўляе, што ён зьяўляецца нацыяналістам, дэмакратам, патрыётам. «Мае-ж ворагі супраць маёй ідэі, праграмы». «Ідэя», аб якой гаварыў Гаргулаў, зводзіцца да вайны капіталістычных краін супроць СССР.

Старшыня суда пытаецца Гаргулава аб яго службе пры савецкай уладзе.

Гаргулаў заяўляе, што ён быў прымушан працаваць у якасьці мэдыка. Старшыня пераходзіць да пытаньня аб пераезьдзе Гаргулава ў Менск, аб яго ўдзеле ў арганізацыі зялёных і бегстве ў Польшчу.

Гаргулаў падкрэсьлівае, што ён прымушан быў кінуць сям'ю і схавацца, бо прымаў удзел у нелегальнай арганізацыі Савінкава — «прыяцеля Керанскага», які змагаўся супроць камунізму».

У далейшых адказах на самыя розныя пытаньні Гаргулаў парываецца гаварыць аб сваёй «ідэі» ,але ўвесь час перарываецца старшынёю.

Старшыня задае рад пытаньняў адносна брудных спраў, зьвязаных з прабываньнем і мэдыцынскай практыкай Гаргулава ў Чэха-Славакіі (незаконныя аборты, сэмах на згвалтаваньне, пабоі).

Гаргулаў заяўляе, што гэта ўсё палітычная інтрыга, змова супроць яго, яго «ідэі», з боку агентаў камунізму. На ўказаньні старшыні, што паводле вестак чэха-славацкай улады, Гаргулаў па чарзе ўступаў у чатыры партыі, у тым ліку і ў кампартыю, **Гаргулаў адказвае, што гэтыя весткі вымышлены, бо ён быў толькі членам сацыял-дэмакратычнай партыі і абвінавачаньне яго ў прыналежнасьці да кампартыі зьяўляецца інтрыгай манархістаў.**

„ПЕРАМОГА“ НАЦЫЯНАЛ-ЦАРАНІСТАЎ

(Да вынікаў парляманцкіх выбараў у Румыніі)

Як вядома, парляманцкія выбары ў Румыніі з прычыны нябывалага нават для баярскай Румыніі тэрору скончыліся перамогай урадавай партыі нацыянал-цараністаў. Вайда-Ваявода, Маніу і іншая нацыянал-царанісцкая зграя сьвяткуе «перамогу».

За некалькі дзён да выбараў адна бухарэсцкая газэта пісала: «Паляваньне па дзікіх качак, бэкасаў і іншых балотных птушак дазваляецца з 1 жніўня. **У палітычным балоце паляваньне на людзей дазволена ўжо да выбараў».**

І сапраўды, такіх крывавых выбараў яшчэ ня было ў Румыніі. Параненыя і забітыя прадстаўнікі розных партый і проста «грамадзяне», якія нават ня зьбіраліся прымаць удзел у выбарах, налічваюцца дзесяткамі і сотнямі. **Тысячы рабочых і селян былі арыштаваны «за камунізм» галоўным чынам таму, каб не дапусьціць падачы сваіх галасоў за сьпісы рабоча-сялянскага блёку, каб не дапусьціць у парлямант рэвалюцыйных прадстаўнікоў працоўных мас.** Несьвядомая частка насельніцтва прымушалася сілай падаваць свае галасы за ўрадавы сьпіс. У радзе месц рабочых і селян проста сілай жандары прымушалі галасаваць за ўрадавы сьпіс.

На парляманцкіх выбарах мінулага году кандыдатуры рабоча-сялянскага блёку былі выстаўлены ў 29 паветах, цяпер усяго **ў 5-6.** І толькі з прычыны шалёнага тэрору і спэцыяльнага выбарчага закону ні адзін кандыдат рабоча-сялянскага блёку ў парлямант ня трапіў, хаця ня гледзячы на масавыя арышты, нават у тых некалькіх пунктах, дзе ўдалося выставіць сьпісы рабоча-сялянскага блёку, **сабрана 11 тыс. галасоў** — 11 тыс. гераічных галасоў сьвядома і адважна паданых наперакор крываваму тэрору кіруючых клясаў.

Працоўныя масы Румыніі і акупаваных абласьцей на прыкладзе толькі што праведзеных выбараў яшчэ раз пераканаліся, што не ад буржуазнага парлямантарызму чакаць ім выратаваньня і выхаду з капіталістычнага рабства. Сваёй актыўнасьцю, ня гледзячы на суровы тэрор, у парляманцкай выбарчай кампаніі працоўныя масы паказалі рост рэвалюцыйнай сьвядомасьці, узрастаючую рашучасьць і гатоўнасьць да клясавай барацьбы за рэвалюцыйны выхад з крызісу.

Рад масавых выступленьняў зьяўляецца тым больш паказальным, што «дэмакратычныя» нацыянал-царанісцкія ўлады з перных-жа дзён кіраўніцтва Вайда-Ваяводы пачалі праводзіць масавыя арышты ўсіх тых, хто здаваўся ім здольным быць «камуністычным агітатарам», «падбухторшчыкам», ці арганізатарам мас. Тым ня менш рэвалюцыйныя выступленьні адбыліся ў радзе месц.

У **Кішыневе,** ня гледзячы на тое, што яшчэ ў чэрвені былі арыштаваны і адданы пад суд дзесяткі «кіраўнікоў» і арыштавана было таксама шмат масавікоў-рабочых, **— на дэманстрацыю 10 ліпеня вышлі з лёзунгамі пратэсту супроць тэрору, у абарону рабоча-сялянскага блёку тысячы рабочых.** У часе разгрому дэманстрацыі адзін рабочы забіт, некалькі дзесяткаў паранена, дзесяткі арыштаваны і скалечана потым на «допыце» ў ахранцы. Акрамя гэтага адбыліся дэманстрацыі **ў Бухарэсьце** і іншых гарадох, а таксама і ў вёсках.

Актывізацыя фашызму ў Румыніі ў сувязі з выбарамі дасягнула крайніх межаў. Яна праявілася ў самых крывавых і пагромна-хуліганскіх формах. Выбары абярнуліся ня толькі ў жорсткі паход супроць працоўных мас і, у прыватнасьці, супроць прыгнечаных нацыянальнасьцяй, але і ў крывавую бойку паміж рознымі групамі самой буржуазіі.

Але ўсё-ж крывавая барацьба паміж групамі буржуазіі за ўладу не перашкаджае адзінству фронту ўсіх буржуазных партый супроць камуністаў і супроць рабоча-сялянскага блёку. Стварыўшы спэцыяльны міжпартыйны камітэт абароны «свабоды выбараў», абураючыся з прычыны найменшага парушэньня ўрадам правоў буржуазных выбаршчыкаў, **усе «апазыцыйныя» буржуазныя партыі да сацыял-дэмакратычнай уключна дружна аплёдавалі самым дзікім рэпрэсіям ураду і яго агентаў на мясцох супроць рэвалюцыйных рабочых і селян.**

І калі румынскія сацыял-дэмакраты выступалі аднойчы з «пратэстам» супроць таго, што ўлада перашкаджае рэгістрацыі «камуністычных сьпісаў» і арыштоўвае кандыдатаў гэтых сьпісаў і інш., дык **гэты «пратэст» быў па сутнасьці толькі больш гібкім манэўрам таго-ж адзінага фронту буржуазіі,** у якім сацыял-фашысты складаюць адно з важнейшых зьвеньняў. Сацыял-фашысты двудушна «пратэставалі» супроць антыкамуністычнага прадвыбарчага тэрору толькі таму, што ён, паводле іх выразу, «парушае інтарэсы свабоднай барацьбы супроць камунізму», г. зн. прасьцей гаворачы, перашкаджае сацыял-фашыстам дурманіць галовы адсталым пластом працоўных.

«Апазыцыйныя» партыі маюць у новым румынскім парлямансе толькі 25 проц. месц. Сацыял-дэмакраты атрымалі 6 мандатаў.

Характэрна, што ў буйнейшым прамысловым цэнтры, у сталіцы — Бухарэсьце, сацыял-фашысты атрымалі **менш** галасоў, чым рабоча-сялянскі блёк. Сацыял-дэмакраты сабралі тут **2.300** галасоў, а рабоча-сялянскі блёк — **2.400,** разам з ваколіцамі Бухарэсту — **звыш 3.000.** Гэта тым больш знамянальна, што ўсяго год назад рабоча-сялянскі блёк у тым-жа Бухарэсьце, пры менш напружаным урадавым тэроры, атрымаў толькі 400 галасоў.

Рэвалюцыянізаваньне працоўных мас як у горадзе, так і на вёсцы адбываецца шпаркімі тэмпамі. Рэвалюцыйныя выступленьні працоўных пад кіраўніцтвам кампартыі супроць фашысцкай дыктатуры набываюць усё больш масавы характар і адзначаюцца сваёй заўзятасьцю. Недалёк той час, калі пралетарыят баярскай Румыніі, пад кіраўніцтвам брацкай камуністычнай партыі, выступіць на апошні рашаючы штурм капіталістычнага ладу, за савецкую Румынію.

В. ДЭМБО.

«ДЭМАКРАТЫЧНЫЯ» ПАРЛЯМАНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў РУМЫНІІ.

НАНКІНСКІ УРАД АБВЯСЬЦІЎ ПАШТОВУЮ БЛЕКАДУ МАНЧЖУРЫІ

ТОКІЕ, 26. Згодна паведамленьня агэнцтва «Сімбун Рэнга» з Мукдэну, начальнік дэпартаманту паштовых апэрацый у міністэрстве сувязі манчжурскага ўраду заявіў, што паколькі нанкінскі ўрад абвясьціў паштовую блёкаду, манчжурскі ўрад адмаўляецца адставіць ад службы вінаватых.

***

ТОКІЕ, 26. «Сімбун Рэнга» ўказвае, што паводле думкі японскіх колаў, Японія чакае да высьвятленьня вынікаў абвешчанай паштовай блёкады ўстрымаецца ад канкрэтных мер. У міністэрстве замежных спраў думаюць, што дагавор з сусьветнапаштовым саюзам і асобныя паштовыя згоды забясьпечаць выхад са становішча і дадуць магчымасьць зьвесьці на нішто блёкаду, абвешчаную нанкінскім урадам. У выпадку-ж, калі блёкада закране японскія інтарэсы, Японія заявіць пратэст.

Партызанскі рух у раёне Жэхэ ўзмацняецца

ТОКІЕ, 26. «Сімбун Рэнга» ўказвае, што паведамленьні з Мукдэна ўказваюць, што адначасова з ускладненьнем становішча ў Жэхэ, пачалася ўзмоцненая актыўнасьць добраахвотніцкіх атрадаў Чжан Сюэ-ляна ў раёнах Жэхэ. Згодна гэтаму паведамленьню, 25 ліпеня некалькі сотень добраахвотнікаў занялі ст. Хуаньды і разбурылі палатно чыгункі.

АПОШНІЯ ВЕСТКІ З ФРОНТУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Пушчан стан халоднага пракату

На заводзе **«Серп и Молот»** (Масква) устаноўлен першы ў Савецкім саюзе стан халоднага пракату. Гэты стан будзе даваць выключна нержавеючую сталь, якая да гэтага часу ўвозілася з-за мяжы.

Ударная работа брыгады сьлесароў і электрыкаў у складзе майстраў **Абрамава, Зязюліна, Ваніна, інжынэра-электрыка Вайнштэйна,** сьлесароў **Рабава, Галініна, Сьмірнова** і электра-манцёра **Кузьняцова** дала магчымасьць скончыць мантаж стану на працягу 28 дзён, ня гледзячы на выключна цяжкія ўмовы; брыгадзе прыйшлося кіравацца пры мантажы толькі фота-здымкамі, бо фірмы не прысылалі чарцяжоў.

Нямецкі майстар **Нахцігаль,** які наведаў «Серп и Молот», аглядаючы стан халоднага пракату, сказаў: «У Германіі такі мантаж пры добрай абстаноўцы, пры наяўнасьці патрэбнага інструманту і абсталяваньня цягнецца больш месяца. У тых умовах, у якіх працавалі вашы рабочыя, мантаж павінен быў цягнуцца тры месяцы».

Устаноўка стану халоднага пракату паклала пачатак стварэньню на вялікім мэталюргічным заводзе **«Серп и Молот»** цэху халоднага пракату.

22 ліпеня адбывалася выпрабаваньне новага стану.

Пушчан новы завод „Дубітель“

НІЖНІ НОЎГАРАД. У горадзе **Можзе, Удмурцкай вобласьці,** пушчан новы завод **«Дубітель».** Завод абсталяваны паводле апошняга слову тэхнікі і ў Саюзе ня мае роўных сабе па магутнасьці. **Можзінскі завод** — першы, які выпрацоўвае экстракт з дзелавой кары. Кара да гэтага часу проста выкідвалася.

З пабудовай можзінскага заводу Саюз вызваляецца ад імпарту экстракту. **Вытворчая магутнасьць заводу запраектавана ў 2.000 тон экстракту ў год.**

С.-г. машыны

Завод Гомсельмаш за 19 ліпеня выпусьціў 17 сіласарэзак «Папэк», што складае 75 проц. дзеннага заданьня; 10 сячкарань —62,5 проц.; 6 бульбасартовак — 37,5 проц. 20 ліпеня зроблена 20 сіласарэзак «Папэк» — 83,3 проц. дзеннага пляну, 14 сячкарань — 87,3 проц. і 8 бульбасартовак — 50 проц.; 21 ліпеня выпушчана 28 сіласарэзак «Папэк» — 116,7 проц. заданьня, 16 сячкарань — 100 проц.

***

На заводзе «Чырвоны мэталіст» за пяцідзеўку з 11 па 20 ліпеня выпушчана 85 жмыхадрабілак, 142 карнярэзкі, 126 бульбакапалак і 15 плугоў.

Апрача гэтага выпрацавана прадметаў шырокага спажываньня **на суму 5.104 р.** Плян пяцідзеўкі выканан на 18,3 проц.

Памяці Пецькі Гузікава

Трагічна загінуў на баявым пасту энэргічны і працавіты камсамолец-партыец — член ЦК ЛКСМБ **Пётр Філіпавіч Гузікаў.**

Петр з 1924 году, году паступленьня на школьную запалкавую фабрыку «Барэсьба» і ў ленінскі камсамол, актыўна і самаадана змагаўся за ажыцьцяўленьне партыйнай партыі і ўраду.

У 1926 г. **тав. Гузікаў** уступае ў партыю і накіроўваецца камсамолам сакратаром Лупалаўскага РК ЛСМ. Пётр зьяўляўся актыўным членам бюро райпарткому і райвыканкому. Потым уходзіць у армію і ў АБВШ, дзе яго выбіраюць адказным сакратаром камсамольскага калектыву.

Пасьля арміі, дзе ён паказаў сябе порадавым ударнікам, бальшавіком, Гузікаў — член бюро ЦК ЛКСМБ, заг. вайсковага аддзелу ЦК.

У апошні час Пётр Гузікаў **[illegible]** і камсамолам быў пасланы працаўніком газэты «Рабочий».

На ўсіх адказнейшых участках работы Гузікаў энэргічна апраўдаў ганаровае імя камсамольца-партыйца.

У асобе трагічна загінутага Гузікава партыя і камсамол страцілі адданага і энэргічнага працаўніка, ініцыятыўнага ўдарніка.

Група таварышоў:
Герцовіч, Ляхаў, Аўгустайціс, Шпіцар, Рубінчык, Цэмас, Гольман, Рэміззвіч, Карнееў, Якубовіч, Курган, Вайнштэйн, Сапега, Глеззэр, Гурзвіч.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Паведамленьні

— 29 ліпеня, у 3 гадз. дня, у залі пасяджэньняў Менгаркому КП(б)Б склікаецца нарада сакратароў парткалектываў і ячэек КП(б)Б. З прычыны важнасьці пытаньня яўка абавязкова.

— Агітмасавы аддзел Менгаркому КП(б)Б 28 ліпеня, у 7 гадз. вечара, у Доме Камасьветы, пакой 19 склікае групавую кансультацыю для агітатараў, дакладчыкаў і прапагандыстаў на тэму: «1-е жніўня — Міжжародны Чырвоны Дзень». Яўка абавязкова і без спазьненьня. Дакладчыкаў вылучаюць самі ячэйкі.

29 ліпеня г. г., роўна ў 7 гадз. вечара, у памяшканьні залі пасяджэньняў гарсавету (пляц Волі № 4, 3-ці паверх)

адбудзецца

ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПЛЕНУМУ МЕНСКАГА ГАРСАВЕТУ.

Яўка членаў і кандыдатаў Савету, загадчыкаў аддзелаў, трэстаў і прымацаваных да працы ў Савеце дэлегатак абавязкова.

Парадак дня:
1) Народна-гаспадарчы плян гораду на III квартал (дакл. т. **Каранеўскі**).
2) Дабрабыт гораду (дакл. т. **Млодак**).
3) Арганізацыйныя пытаньні.

ГАРСАВЕТ.

29 ліпеня, роўна ў 6 гадзін вечара, у памяшканьні залі пасяджэньняў гарсавету адбудзецца

пасяджэньне фракцыі пленуму Гарадзкога Савету.

Фракцыя прэзыдыуму Гарсавету.

Менгарком КП(б)Б з глыбокім жалем паведамляе аб раптоўнай сьмерці члена Менскай арганізацыі КП(б)Б, працаўніка рэдакцыі газэты «Рабочий»

тав. ГУЗІКАВА,

пасьледаваўшай 26 жніўня ў Навадворскім сельсавеце. Гарадзкі камітэт КП(б)Б заклікае членаў партарганізацыі прыняць удзел у пахаваньні, якое адбудзецца сёньня, у 4 з пал. гадзіны.

Менгарком КП(б)Б.

Цэнтральны камітэт ЛКСМБ паведамляе аб сьмерці

т. Пётра Гузікава

члена ЦК ЛКСМБ Х-га скліканьня.

28-VII—г. г., у 6 гадзін вечара, у памяшканьні Менгаркому КП(б)Б (Карла Маркса, 14 2-гі паверх, заля пасяджэньняў, пакой № 32)

адбудзецца

ПА-ЗАЧАРГОВЫ ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ Мен. гарКК КП(б)Б—РСІ

сумесна з актывам РСІ (члены і кандыдаты КП(б)Б)

з парадкам дня:

Аб чарговых задачах КК-РСІ.

На пленум апрача членаў гарКК павінны зьявіцца: 1) сакратары п/к і калектыўнаў ЛКСМБ (члены і кандыдаты партыі) наступных прадпрыемстваў: зав. „Бальшавік“ зав. імя Варашылава, зав. „Камунар“, зав. імя Молатава, ф-ка „Кастрычнік“, абутковая ф-ка, хлебазавод, друкарня імя Сталіна, „Ударнік“, „Полымя Рэвалюцыі“, шчотачна, ф-ка, цягі, 2) парт. засядацелі, 3) грамадзкія інспэктары (члены і канд. партыі), 4) рэдактары шматтыражак і насьценгазэт (члены і канд. партыі), 5) рабочыя засядацелі (члены і канд. партыі), 6) начальнікі пастоў РСІ (чл. і канд. партыі), 7) старшыні ЗРК і рэўкамісіі (чл. і канд. партыі), 8) старшыні сэкцый РСІ Гарсавету (чл. і канд. партыі) 9) члены парткалегіі, 10) начальнікі „ЛК“ (члены і канд. партыі).

Яўка ўсіх вышэйпамянёных абавязкова і без спазьненьня.

29-га ліпеня 1932 г., у 6 гадз. вечара, у габінэце наркома працы БССР (Чырвонаармейская № 16, 3-ці паверх), згодна пастановы СНК БССР

склікаецца **НАРАДА** па пытаньні падрыхтоўкі гіліцэнтуры і транспарту да асеньня-зімовых перавозак.

На нараду выклікаюцца:—адказныя прадстаўнікі Загатзярно, Саюзмука, Белкааплодагародніна, Белплодагародніна, ЛСПО, МСПО, Беллесаснабзбыт, Лесбел, НКСнаб, НКЦяжпрам, НКЛегпрам, Саюзтранс, Белсампрамсаюз, Галоўдартранс і НКГасп., НК - РСІ (транспартная група), АДПУ (транспартны аддзел), Дзяржплян (транспартная сэкцыя), Упаўнаважаны НКШлях. Зносін, ДДРэч. Флёту, Камэту па перавозках і прадстаўнікі друку газэт „Зьвязда“ і „Рабочий“.

Яўка прадстаўнікоў пералічаных арганізацый з падрабязнымі матар'ялам і абавязкова.

Час. вык. аб. старшыні камітэту па перавозках—народны камісар Працы БССР **Баскін.**

Адказны сакратар камітэту па перавозках **Хацкевіч.**

ЛЕТНІ ТЭАТР САДУ „ПРАФІНТЭРН“
Ад 26 ліпеня зусім абноўленая праграма 4-га цыклю эстрадна-цыркавых паказаў
МЮЗІК-ХОЛ
у 2-х аддзяленьнях.

Чыр. Зорка Пач.: 6, 7-30, 9, 10-30, Каса—з 4 г. Мастацкі гістарычны фільм Камэдыянтка прана ў 6 частках Звыш праграм.—хроніка Саюзкіно

„Інтэрнацыянал“ Гарольд Лёйд у амэрык.-камэдыі Баязьлівасьць да жанчын Звыш праграм. хроніка Саюзкіно

Кіно „Пралетары“ Мастацкі фільм СЭВІЛЬ Звыш праграм. хроніка Саюзкіно. Дзесныя дзіцячыя сэансы Бясспрытульны спартсмэн Звыш праграм хроніка Саюзкіно

„СПАРТАК“ Пач.: 6-30, 8, 9-30, 11 г. Каса—зд 5 г. Заменны мастацкі фільм Праект інжынэра Стронга Драма ў 6 частках.

ПУБЛІКАЦЫІ аб згубе дакумантаў у газ. „Зьвязда“ НЯ ПРЫМАЮЦЦА.

Сёньня, 28 ліпеня, у 6 гадз. вечара, у памяшканьні клюбу мэтал